А.А.Страха
дацэнт Беларускага універсітэта культуры

# УМОВЫ ЭФЕКТЫЎНАГА ПРАВЯДЗЕННЯ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ

Адным з важнейшых звёнаў падрыхтоўкі будучага спецыяліста сацыякультурнай сферы з'яўляецца педагагічная практыка. Яна садзейнічае фарміраванню педагагічнага мыслення, набыццю вопыту педагагічнай дзейнасці, выпрацоўцы якасцей, неабходных для прафесійнай дзейнасці.

Важнай перадумовай эфектыўнасці практыкі з'яўляецца дакладнае вызначэнне яе задач. Педагагічная практыка вырашае задачы двух відаў:

а) агульныя, якія вызначаюць змест практыкі ў цэлым;

б) паэтапныя, якія адносяцца да арганізацыі педпрактыкі на асобных курсах навучання.

З нашага пункту гледжання, да агульных задач педпрактыкі адносяцца наступныя:

— паглыбленне і замацаванне сувязі тэарэтычных ведаў, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні спецыяльных псіхолага-педагагічных дысцыплін, з вучэбна-выхаваўчай практыкай;

— фарміраванне прафесійных уменняў і навыкаў, неабходных для паспяховага ажыццяўлення вучэбна-выхаваўчай работы;

— набыццё прафесійных якасцей асобы будучага педагога (камунікатыўнасць, імкненне да творчасці, педагагічная перакананасць і інш);

— фарміраванне педагагічнага мыслення, якое садзейнічае разуменню педагагічных з'яў і фактаў і распрацоўцы спосабаў практычнага пераатварэння педагагічнай сітуацыі.

Педагагічная дзейнасць складаная і шматаспектная. Яе пазнанне і засваенне патрабуе доўгага часу, таму і педпрактыка павінна мець працяглы характар.

На нашу думку, этапнасць педагагічнай практыкі забяс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

печвае паступовае ўскладненне педагагічнай дзейнасці студэнтаў у адпаведнасці з узроўнем іх псіхолага-педагагічнай, метадычнай і спецыяльнай падрыхтоўкі.

Паэтапныя задачы педпрактыкі можна падзяліць на дзве групы:

а) задачы пасіўнага этапу практыкі:

— назіранне розных формаў і відаў вучэбна-выхаваўчай работы ў школе і пазашкольных установах;

— азнаямленне студэнтаў з сучасным станам вучэбна-выхаваўчай работы ў школе;

— фарміраванне ўменняў аналізаваць стан вучэбна-выхаваўчай работы, вылучаць метады і методыкі, якімі карыстаюцца педагогі;

— фарміраванне ўменняў весці назіранні за вучнямі і дзіцячым калектывам;

б) задачы актыўнага этапу практыкі:

— арганізацыя ўзаемадзеяння студэнтаў з вучнямі, вывучэнне іх індывідуальных і ўзроставых асаблівасцей;

— выпрацоўка ў студэнтаў творчага даследчага падыходу да педагагічнай дзейнасці;

— набыццё навыкаў аналізу вынікаў сваёй працы, фарміраванне патрэбнасці ў самаадукацыі;

— фарміраванне ў студэнтаў арганізатарскіх якасцей (арганізацыя дзіцячага калектыву і інш.).

На нашу думку, задачы і змест педпрактыкі нельга зводзіць толькі да выпрацоўкі ўменняў падрыхтаваць і правесці сістэму заняткаў (урокаў). Галоўнае — навучыць студэнтаў творча рашаць педагагічныя задачы, суадносіць першапачатковы вопыт з педагагічнай тэорыяй.

Другім момантам, на які неабходна звярнуць увагу, сама арганізацыя практыкі.

Кожны студэнт напачатку практыкі павінен дакладна ведаць месца, тэрмін практыкі, змест сваёй дзейнасці, патрабаванні да дзейнасці студэнтаў, крытэрыі адзнакі кожнага віду дзейнасці, віды справаздачнай дакументацыі, яе

змест і тэрмін прадстаўлення, кіраўнікоў практыкі і характар дапамогі, якую яны могуць аказаць студэнту.

Рэалізацыі гэтага моманту практыкі будуць спрыяць правядзенне канферэнцыі студэнтаў перад практыкай, на якой асвятляюцца ўсе вышэйпералічаныя аспекты, а таксама метадычныя заняткі, якія праводзяцца групавымі кіраўнікамі практыкі.

Асноўная функцыя такіх заняткаў — аказанне метадычнай дапамогі студэнтам у распрацоўцы канспектаў заняткаў, плана выхаваўчых мерапрыемстваў, правядзенне кансультацый па складанні псіхолага-педагагічнай характарыстыкі на вучня і дзіцячы калектыў, дапамога ў вырашэнні педагагічных задач.

Добрай арганізацыі практыкі таксама будзе садзейнічаць сістэматычнае вызначэнне вынікаў знаходжання ў школе кожнага студэнта. Гэтаму можа спрыяць распрацоўка розных заданняў і прадстаўленне вынікаў іх выканання ў вызначаныя тэрміны.

Эфектыўнасці правядзення практыкі спрыяе добрая тэарэтычная падрыхтаванасць студэнтаў, паколькі выпрацоўка педагагічных уменняў і навыкаў забяспечваецца толькі пры ўмове, калі ў студэнта маецца грунтоўнае веданне сутнасці і складанасці дзейнасці педагога, асэнсаваны падыход да ажыццяўлення ўзаемадзеяння з дзецьмі і імкненне да творчага рашэння канкрэтных вучэбна-выхаваўчых задач.

Усё абазначанае яскрава сведчыць аб важнасці адпаведнай падрыхтоўкі студэнтаў да практыкі. Галоўную ролю ў гэтым, безумоўна, прызваны адыграць такія дысцыпліны, як агульная і ўзроставая псіхалогія, педагогіка і спецыяльныя методыкі.

На нашу думку, павышэнню эфектыўнасці педпрактыкі можа спрыяць уключэнне ў вучэбныя планы спецыяльных курсаў, семінараў, практыкумаў па асобных пытаннях тыпу "Вырашэнне педагагічных задач", "Арганізацыя творчых заняткаў", "Псіхолага-педагагічнае вывучэнне вучняў і творчага калектыву" і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Але педпрактыка толькі тады можа стаць эфектыўным сродкам падрыхтоўкі да педагагічнай дзейнасці, калі ў студэнта ёсць жаданне і імкненне стаць добрым педагогам, калі ён свядома арганізуе працэс сваёй прафесійнай самаадукацыі і самавыхавання, калі ён разумее сваю адказнасць за адукацыю і выхаванне падрастаючага пакалення.

Такім чынам, умовамі эфектыўнасці правядзення педпрактыкі студэнтаў універстэта культуры з'яўляюцца:

1. Дакладнае ўяўленне агульных і паэтапных задач педпрактыкі.
2. Арганізацыя практыкі і дапамога студэнту на працягу практыкі.
3. Неабходнасць тэарэтычнай падрыхтоўкі студэнтаў да практыкі.
4. Актуалізацыя значнасці педпрактыкі для далейшай прафесійнай дзейнасці студэнта ў сацыякультурнай сферы.

Э.С.Суддзя,
дацэнт Беларускага універсітэта культуры

## ВЫТВОРЧАЯ ПРАКТЫКА — ЧАСТКА ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ ГУМАНІТАРНАГА ПРОФІЛЮ ФБІС

Мадэль практыкі — гэта сістэма дзеянняў і ўзаемадзеянняў студэнтаў, выкладчыкаў, чытачоў бібліятэкі, накіраваных на фарміраванне суб'ектнасці будучага бібліёграфа-бібліятэкара. Сістэма ўзаемадзеянняў, напрыклад, імітуе сутнасць структуры бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці ў гуманітарных галінах, а таксама ўмовы аптымальнага развіцця ўдзельнікаў бібліяграфічнага працэсу (у першую чаргу асобаснага, прафесійнага развіцця студэнтаў).

Метадалагічнай асновай мадэлі вытворчай практыкі студэнтаў нашай ВНУ ў гэтым выпадку становіцца канцэпцыя фарміравання будучага бібліятэкара-бібліёграфа, яго